2155б. Гарадзішча-2. За 0,5 км на поўнач ад вёскі, на беразе воз. Шэвіна. Пляцоўка круглая, дыяметрам 30 м, вышынёй 4 м. Вядома з 1873 г. Абследаваў у 1974 г. Г. В. Штыхаў. Культурны пласт да 0,5 м. Знойдзены абломкі ляпных гаршкоў слоікавай формы. Належала балцкім плямёнам, адносіцца да ранняга жалезнага веку.

Матэрыялы абследавання гарадзішчаў захоўваюцца ў Інстытуце гісторыі АН БССР.

Літ.: Алексеев Л. В. Археологические памятники эпохи железа в среднем течении Западной Двины.— У кн.: Вопросы этнической истории народов Прибалтики.— М., 1959.— (Труды Прибалтийской объединенной комплексной экспедиции; [т.] 1); Сведения 1873 г. о городищах и курганах.— Известия Археологической комиссии. СПб., 1903, в. 5.

Г. В. Штыхаў.

2156. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). На заходняй ускраіне вёскі. Пахаваны 80 мірных жыхароў вёсак Рылі (57 чалавек), Гарбачэва, Канашонкі і інш., спаленых 11.2.1943 г. нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У 1965 г. на ўшанаванне памяці ахвяр фашызму на магіле пастаўлены абеліск.

2157. МАГІЛА АХВЯР ФАШЫЗМУ (гіст.). За 2 км на поўнач ад вёскі, ва ўрочышчы Шэвіна. Пахаваны 18 жыхароў в. Шэвіна, расстраляных нямецка-фашысцкімі карнікамі ў 1943 г. У 1967 г. на магіле пастаўлены абеліск.

в. Сакалішча, цэнтр сельсавета

2158. БРАЦКАЯ МАГІЛА САВЕЦКІХ ВОІНАЎ І ПАРТЫЗАН (гіст.). Каля



2160. *Помнік землякам.*



2161. *Стэла-ўказальнік з рэльефнай выявай Я. П. Кульнева.*

будынка выканкома сельсавета. Пахаваны 97 воінаў і партызан, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну. У 1948 г. на магіле пастаўлены абеліск.

2159. ГАРАДЗІШЧА (археал.). На заходняй ускраіне вёскі, у выгіне р. Нішча. Плошча 3 га. Абследавалі ў 1955—56 гг. Л. В. Аляксееў, у 1971 г. Г. В. Штыхаў. Раскопкі не праводзіліся.

2160. ПОМНІК ЗЕМЛЯКАМ (гіст.). У цэнтры вёскі. На ўшанаванне памяці воінаў-аднавяскоўцаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну, у 1974 г. пастаўлены помнік — скульптура воіна.

2161. ПОМНІК КУЛЬНЕВУ Якаву Пятровічу (гіст.). За 7 км на поўдзень ад в. Сакалішча, 0,8 км справа ад аўтамабільнай дарогі на Полацк, каля былой в. Сівошына (тэрыторыя з 1977 г. ў Полацкім р-не).

Герой Айчыннай вайны 1812 г. Я. П. Кульнеў нарадзіўся 25.7.1763 г. ў г. Лудза (цяпер Латвійская ССР) у сям'і афіцэра. У 1785 г. скончыў сухапутны шляхецкі корпус, служыў у гусарскім палку. Удзельнік руска-турэцкай вайны 1787—91 гг. У Польскай кампаніі ў 1794—95 гг. вызначыўся ў баях пад Кобрынам, Вільняй, Лідай. У час вайны з Францыяй у 1807 г. камандаваў Гродзенскім гусарскім палком. У руска-шведскую вайну і ў 1808—09 гг. камандаваў авангардам корпуса П. І. Баграціёна, у руска-турэцкую — перадавымі кавалерыйскімі атрадамі (1810—11 гг.). Прытрымліваўся дэмакратычных поглядаў, выступаў супраць аракчэеўшчыны. Сваіх прыгонных адпусціў на волю.

У пачатку Айчыннай вайны 1812 г. генерал-лейтэнант Я. П. Кульнеў — камандзір пяцітысячнага кавалерыйскага атрада 1-га пяхотнага корпуса генерала П. Х. Вітгенштэйна. 3.7. 1812 г. атрад імклівым ударам разбіў праціўніка каля Друі, 18 ліпеня папярэдзіў абыходны манеўр французскіх войск корпуса маршала Н. Ш. Удзіно, перарэзаў праціўніку дарогу паміж вёскамі Клясціцы і Якубова. У гэтым баі атрад пад камандаваннем Я. П. Кульнева нанёс цяжкае паражэнне французскім войскам, захапіў амаль увесь абоз корпуса Удзіно і 900 палонных. У апошні дзень Клясціцкай бітвы Я. П. Кульнеў быў смяротна паранены, памёр 20.7.1812 г.

На месцы гібелі Я. П. Кульнева ў 1830 г. пастаўлены абеліск, на павароце з аўтамабільнай дарогі да гэтага помніка ў 1972 г.— стэла-ўказальнік. Імем героя названы вуліцы ў Полацку і Лудзе, вёска ў Расонскім р-не (былая Царкавішча). Гл. таксама артыкул № 2113 «Помнік у гонар перамогі рускіх войск».

Літ.: Елец Ю. Л. Герой Отечественной войны — Кульнев.— СПб., 1912; Корнейчик Е. И. Белорусский народ в Отечественной войне 1812 года.— Мн., 1962.

Т. Р. Чуракова.

в. Сельнікі, Краснапольскі сельсавет

2162. МЕСЦА ДЗЕЙНАСЦІ ПАДПОЛЬШЧЫКАЎ (гіст.). У Вялікую Айчынную вайну ў вёсках Сельнікі і Краснаполле ў жніўні 1941 г. была створана і да 10.5.1942 г. дзейнічала падпольная арганізацыя (кіраўнік С. І. Голубеў) Расонскага камуністычнага падполля. Патрыёты вялі масава-палітычную работу сярод насельніцтва, зрабілі напад на Краснапольскую валасную ўправу і захапілі складзеныя для гітлераўскай камендатуры спісы камуністаў і камсамольцаў, вызвалілі ваеннапалонных Краснапольскага канцэнтрацыйнага лагера, узарвалі наплаўны мост цераз р. Дрыса. З вясны 1942 г. падпольшчыкі працягвалі барацьбу з ворагам у партызанах.

У 1975 г. ў гонар дзейнасці патрыётаў-падпольшчыкаў на паўночнай ускраіне вёскі пастаўлена стэла.

в. Сінск, Клясціцкі сельсавет

2163. ГАРАДЗІШЧА (археал.). Мясцовая назва Гараватка. За 0,5 км на ўсход ад вёскі, на ўзгорку. Пляцоўка авальная, памерам 100×200 м. Адкрыў у 1955 г. Л. В. Аляксееў, абследаваў у 1968 г. і 1971 г. Г. В. Штыхаў. Раскопкі не праводзіліся.



2161. *Помнік Я. П. Кульневу.*